# Калядныя чытанні

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця IX Беларускіх Калядных чытанняў “Праваслаўе і айчынная культура: страты і набыткі мінулага, вобраз будучыні”.**




Адкрываючы форум, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, адзначыў, што сёлета Калядныя чытанні прысвечаны асэнсаванню шматвяковага шляху праваслаўя і культуры на беларускіх землях.

Адзначана, што сучасны свет, у якім паўстала нямала вострых супярэчнасцей і крызісных праблем, мае патрэбу ў мабілізацыі ўсяго арсенала людскіх рэсурсаў для зацвярджэння рэальнага гуманізму, сапраўднай свабоды, матэрыяльнага дабрабыту і духоўнага багацця асобы. У гэтых умовах асабліва ўзрастае значнасць узаемадзеяння і супрацоўніцтва ўсіх сацыяльных інстытутаў, у тым ліку найважнейшых з іх — дзяржавы і царквы.

“Будучыня нашай краіны напрамую залежыць ад духоўна-маральнага абнаўлення грамадства, і асаблівую значнасць набывае задача патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення. Гэтую задачу неабходна асэнсаваць як адну з прыярытэтных у развіцці сістэмы адукацыі, аснову бяспекі Беларусі”, — падкрэсліў намеснік міністра адукацыі Аляксандр Кадлубай.

Ён выказаў упэўненасць, што сумесная работа ўнясе значны ўклад у захаванне і ўзбагачэнне духоўных і маральных традыцый беларускага народа як дзейснай асновы выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі нашай краіны.

Акрамя таго, у рамках адкрыцця Калядных чытанняў прайшло ўзнагароджанне пераможцаў творчых і сацыяльных духоўных конкурсаў — прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў краіны. Тэма сёлетніх чытанняў знойдзе адлюстраванне ва ўсіх мерапрыемствах форуму, у тым ліку і ва ўстановах адукацыі краіны.

**По матэрыялах сайта Мінадукацыі падрыхтавала Вольга БАРЫСЕВІЧ.**
**Фота Кацярыны РУМЯНЦАВАЙ.**